прымяненне атрыманых ведаў у зменenай сітуацыі, праверку ведаў вучняў. Адным з эфектыўных прыёмаў на дадзеным этапе з'яўляецца *мадэляванне*. "Што магло б адбыцца, калі б … ? Як паступілі б вы? Як бы разгортваўся сюжэт твора, калі б персанаж быў надзелены супрацьлеглай рысай характару?"

Выкарыстанне тэхналогіі праблемнага навучання дазваляе пазбегнуць пасіўнасці вучняў у працэсе ўспрымання вучэбнага матэрыялу, забяспечвае для кожнага пасільную нагрузку, спрыяе стварэнню атмасферы добразычлівасці і ўзаемнай падтрымкі.

Праблемнае навучанне садзейнічае паспяховай сацыялізацыі вучняў. Калі вучань здольны знайсці адказ на праблемнае пытанне ў вучэбнай дзейнасці, то ён будзе здольны вырашыць і любую іншую сацыяльную ці жыццёвую праблему.

**Літаратура**


1. Кульневич, С.В. Современный урок / С.В. Кульневич, Т.П. Лакоценина. – Часть III: Проблемные уроки. Научно-практическое пособие. – Ростов н/Д: Учитель, 2006. – С. 26-27.
2. Руцкая, А.В. Умовы эфектыўнасці літаратурнага навучання / А.В Руцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 15–17.
3. Селевко, Г.К. Проблемное обучение / Г.К. Селевко // Школьные технологии. – 2006. – № 2. – С. 61–65.



**М.В. Лапаціна** (ДУА "Полацкая дзяржаўная гімназія № 1 імя Францыска Скарыны")


## ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ АКТЫВАЦЫІ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ


***Ключавыя словы:*** інтэлект-карта, воблака слоў, табліца, дыяграма, кросэнс.


Апошнім часам значна паскорыўся тэмп жыцця і адпаведна павялічыўся аб'ём інфармацыі, якую мы павінны успрыняць, засвоіць і перадаць. Даказана, што мысленне сучаснага чалавека больш эфектыўна ўспрымае вобразы,чым вербальныя сродкі. І гэта натуральна: ідэаграмы і смайлы ў тэлефонах, рэкламныя прапекты і бігборды на вуліцах, а яшчэ інтэрнэт, тэлебачанне. Настаўніку неабходна быць мабільным, крэатыўным, каб адпавядаць патрабаваням часу, каб вучням разам з ім захацелася даведвацца пра нешта новае. Адным са спосабаў рашэння

дадзенай праблемы з'яўляецца выкарыстанне сродкаў візуалізацыі інфармацыйнай плыні.

Існуе шмат спосабаў візуалізацыі матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Пра некаторыя з іх пойдзе размова далей.

**Інтэлект-карта** – адзін з асноўных спосабаў стварэння візуальнага вобраза, метад арганізацыі ідэй, задач, канцэпцый і любой іншай інфармацыі У цэнтры – галоўная ідэя, ад яе адыходзяць ключавыя думкі, якія можна дзяліць на падпункты да таго часу, пакуль не будзе структуравана ўся інфармацыя. Аўтар інтэлект-карт (Тоні Б'юзэн) рэкамендуе выкарыстоўваць колер, пачынаючы з чырвонага (высокая ступень успрымання) і заканчваючы зялёным і блакітным (нізкая ступень успрымання). Падчас стварэння інтэлект-карт таксама выкарыстоўваюцца ключавыя словы, умоўныя знакі, малюнкі, відэаролікі, аудыётрэкі. Настаўнік спачатку прадстаўляе вучням мадэль карты, якую неабходна запоўніць. Так, на ўроку беларускай літаратуры ў 9 класе пры знаёмстве з асобай Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча можна прапанаваць шаблон інтэлект-карты, у цэнтры якой будуць асобы пісьменнікаў, ад якіх ідуць адгалінаванні "жыццё" і "творчасць". Яны, у сваю чаргу, маюць свае галіны. Вучні "апранаюць" гэтыя галіны інфармацыяй, затым агучваюць тое, што атрымалася. Паступова фарміруецца ўменне ствараць уласную карту. Асабліва прадуктыўным будзе выкарыстанне інтэлект-карт пры вывучэнні аглядавых тэм па літаратуры: "Літаратура 20-30 гг. 20 стагоддзя", "Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны" і інш. Ёсць спецыяльная электронныя праграмы для стварэння разумных карт, напрыклад: MindMeister, Xmind, Goggle, Mind42, Bubbl.us, SimpleMind, Mapul.

Работа з ключавымі словамі на ўроках можа ажыццяўляцца і праз выкарыстанне **воблака слоў**.- візуальнага прадстаўлення слоў, паняццяў, тэрмінаў. Воблака слоў можна выкарыстоўваць на любых этапах урока. Так, вучням 10 класа неабходна было актуалізаваць веды па беларускай літаратуры за 9 клас, абапіраючыся на ўласныя назоўнікі. У выніку ў дзяцей атрымалася пісьмовае паведамленне, у якім яны ўзгадалі вядомыя прозвішчы асветнікаў, пісьменнікаў, цікавыя і запамінальныя факты з іх жыцця і творчасці, яркія цытаты з твораў, вывучаных на памяць. На адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе па беларускай літаратуры ў прапанаваных да ўрокаў відэафрагментах настаўнікі выкарыстоўваюць воблака слоў (тэмы "Ян Чачот", "М. Зарэцкі"). Пададзеныя настаўнікам прыклады даюць магчымасць дзецям ствараць уласныя воблакі слоў, на аснове іх ствараць другасныя тэксты.

Вядома, што пры вывучэнні мовы і літаратуры. настанік значную ўвагу ўдзяляе рабоце з тэкстам. Практыка паказвае, што беларускамоўныя тэксты вучням цяжка ўспрыняць і зразумець. Таму лагічным будзе выкарыстанне сістэмы заданняў з графічнымі элементамі, якая дапаможа

знайсці пэўную інфармацыю, інтэрпрэтаваць тэкст. Заданні могуць быць наступныя:

1. Разгледзець графічныя выявы (фотаздымкі, схемы), вызначыць магчымую тэму тэксту.

2. Падабраць фотаздымкі ці малюнкі, якія б ілюстравалі змест тэксту, тэматыка якога папярэдне невядомая.

3. Выкарыстанне табліцы, у якой частка інфармаці адсутнічае. (Запоўніць табліцу пасля прачытання тэксту)

Так, у 5-6 класах пры падрыхтоўцы да перакладу на беларускую мову можна выкарыстаць заданне наступнага тыпу:

***Складзіце перакладны руска-беларускі слоўнічак. Для гэтага да слоў падбярыце ў тэксце беларускія адпаведнікі.***

| | |
|---|---|
| Апрель – | Краски – |
| Голубой – | Понравилась – |
| Жаль – | Пятнышки – |
| Кисточка – | Разукрасил – |
| Кое-где – | Хватило – |
| Красивая – | Цвет – |
| Розовый – | Цветы – |

*Прыйшоў Красавік на зямлю. Не спадабалася яму пажоўклая пасля зімы трава, шэрае неба, чорная зямля...*

*Узяў Красавік фарбы і пэндзаль. Размаляваў ён неба ў сіні і блакітны колеры. Затым пайшоў на палі. Дзе зялёнай, дзе жаўтаватай фарбай мазнуў. Намаляваў жоўтыя, белыя, ружовыя, чырвоныя кветкі.*

*Пасля ўзяўся за дрэвы. Цэлы дзень стараўся. Апошняй прыбегла бярозка. Ёй вельмі хацелася стаць прыгожай. Шкада толькі, што фарбы ўсе выйшлі. Пачаў Красавік фарбаваць бярозку ў белы колер. Але і белай не хапіла. Таму і засталіся там-сям чорныя лапінкі.*

Пры характарыстыцы герояў твораў вучням 5 класа даволі складана самастойна стварыць цэласны тэкст. Добрай дапамогай з'яўляюцца табліцы, распрацаваныя Н.М. Міхновіч (Змешчаны у друкаваным рабочым сшытку "Беларуская літаратура. 5 клас").

Для характарыстыкі герояў легенды "Нарач" можна выкарыстаць наступную табліцу:

| **План Характарыстыкі** | **Найрыта** | **Андрэйка** | **Пан** |
|---|---|---|---|
| Знешні выгляд | | | |
| Рысы характару | | | |
| Паводзіны | | | |
| Чым вылучаецца сярод іншых | | | |
| Як склаўся лёс | | | |

Для большай прадуктыўнасці працы з табліцай можна ўдасканальваць і дапаўняць матэрыял, напрыклад:

*Пакіньце толькі тыя рысы характару, якімі валодае герой:*

| **Найрыта** | **Андрэй** | **Пан** |
|---|---|---|
| брыдкая | стары ўдавец | злы |
| добрая | бедны | малады |
| багатая | прыгожы | хітры |
| музычна - адораная | адважны | добры |
| сквапная | бялявы | зайздрослівы |
| чэсная | праўдзівы | багаты |
| самаахвярная | смелы | помслівы |
| спрытная | жыццястойкі | нахабны |
| верная | рашучы | назойлівы |

На ўроках беларускай мовы эфектыўнымі будуць рознага тыпу **дыяграмы.** Іх можна даваць у гатовым выглядзе, а можна прапанаваць вучням стварыць самастойна. Так, пры вывучэнні тэмы "Галосныя літары і гукі" ў 5 класе можна прапанаваць верш *Анатоля Зэкава "Колькі "А" ў птушак?"* . Пасля яго прачытання вучні могуць падлічыць, колькі разоў сустракаецца літара "А" і гук [а] ў назвах птушак з верша і адлюстраваць свае вынікі на дыяграме. Пры пабудове дыяграм лепей карыстацца каляровымі алоўкамі. Як варыянт, у настаўніка ёсць некалькі гатовых дыяграм, а вучням трэба выбраць, якая з іх правільна адлюстроўвае іх адказ.

Для старэйшых класаў работа з вобразамі на ўроках беларускай мовы і літаратуры можа ажыццяўляцца праз складанне кросэнсаў, стварэнне лэпбукаў, відэаролікаў, буктрэйлераў.

**Кросэнс** – асацыятыўная галаваломка, дзевяць малюнкаў, размешчаных такім чынам, што кожны малюнак мае сувязь з папярэднім і наступным, а цэнтральны аб'ядноўвае па сэнсе ўсе. Задача дзяцей – растлумачыць кросэнс, скласці аповед, абапіраючыся на малюнкі. У падручніку па беларускай літаратуры за 10 клас на старонцы 179 прыводзіцца прыклад такога задання на верш М. Багдановіча "Летапісец".

**Лэпбук –** самаробная кніжка-разгортка ці папка, якая змяшчае кішэні, акенцы, рухомыя дэталі, канверты, у якіх змешчаны інфармацыя і заданні на адну тэму. Дадзены сродак дазваляе зрабіць больш разнастайнай работу на ўроку, садзейнічае развіццю творчых здольнасцей, спрыяе лепшаму засваенню інфармацыі. Асабліва эфектыўнымі такія самаробныя разгорткі будуць на абагульняльных уроках па творчасці пісьменнікаў. Работу можна арганізаваць у групах парах, прапанаваўшы абмяняцца лэпбукамі, выканаць заданні, абмеркаваць іх.

**Буктрэйлер** – гэта кароткі відэаролік, які расказвае ў адвольнай мастацкай форме пра кнігу, твор. Мэта буктрэйлера – прыцягнуць увагу да кнігі, твора пры дапамозе візуальных сродкаў. Напрыклад, буктрэйлер на

баладу А. Міцкевіча "Свіцязянка", створаны вучаніцай 9 класа, зацікавіў творам нават тых вучняў, якія не вельмі любяць чытаць.

Калі няма магчымасці ствараць відэафрагменты, можна прапанаваць стварыць **буклет** – кніжачку, друкаванае выданне, якое ўяўляе сабой ліст, складзены пэўным чынам, на кожным баку нанесена тэкставая ці графічная інфармацыя. Буклет дазваляе спалучаць значны аб'ём структураванай інфармацыі з яркім крэатыўным афармленнем. Буклеты, створаныя на творы У.Караткевіча, прыцягнулі ўвагу да асобы і творчасці пісьменніка не толькі дзевяцікласнікаў, але і малодшых вучняў.

Такім чынам, візуалізацыю можна і неабходна выкарыстоўваць на ўсіх этапах урока і ў пазакласнай дзейнасці як сродак павышэння ўспрыняцця інфармацыі, запамінання, развіцця крытычнага і вобразнага мыслення. Візуалізацыя дае магчымасць павялічыць аб'ём інфармацыі, сэканоміць час на ўроку, улічыць індывідуальныя асаблівасці дзяцей, павысіць цікавасць да прадмета.

**Літаратура**


1. Зэкаў, А.М. Лічба з літарай сябруюць: правільныя вершы, загадкі-задачкі / А.М. Зэкаў. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. – 48 с.
2. Міхновіч, Н.А. Беларуская літаратура. 5 клас: рабочы сшытак / Н.А. Міхновіч. – Мінск: Аверсэв, 2016. – 126 с.
3. Яленскі, М.Г. Беларуская мова. 5-6 класы: дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы: дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / М.Г. Яленскі. – Мінск: Сэр-Віт, 2018. – 152 с.



**С.В. Мартынкевіч** (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)


## МЕТАПРАДМЕТНЫ СКЛАДНІК ДЫДАКТЫЧНАГА АПАРАТУ СУЧАСНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ


***Ключавыя словы:*** моўная адукацыя, метапрадметныя вынікі навучання, метадычны апарат, тэкст, вучэбная дзейнасць.


Сучасны адукацыйны стандарт вызначае асноўныя кірункі арганізацыі вучэбнага працэсу, якія накіраваны на асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі навучання. Якасць адукацыі вызначаецца перш за ўсё высокім узроўнем сфарміраванасці асобасных вынікаў – унутраных установак асобы, сістэмы яе каштоўнасных арыентацый, грамадзянскай ідэнтычнасці, матываў да навучання і пазнання, самавызначэння (А.Г. Асмолаў, В.С. Басюк, Н.Л. Галеева, В.С. Мухіна, М.А. Шаталаў і інш.).

Метапрадметныя вынікі навучання ў якасці найважнейшага складніка моўнай адукацыі сталі разглядацца на сучасным этапе развіцця